# Чайка з Прыпяці, дачка Палесся

***Жанчына, аб якой пойдзе гаворка, спалучае ў сабе ўсё найлепшае, што дадзенае чалавеку. Яе жыццё асаблівае, яно ўсё прасякнутае паэзіяй. Жыццё ў вершах.***

Нарадзілася Галіна Дашкевіч 20 лістапада 1947 года ў старажытным Тураве ў сям'і настаўнікаў. Яе бацькі Мікалай Паўлавіч Клімовіч і Марыя Міхайлаўна Клімовіч (Лагвінец) скончылі Мазырскі педагагічны інстытут. Усё жыццё яны аддалі адукацыі і выхаванню маладога пакалення. Бацька пісаў вершы і нарысы пра землякоў, друкаваўся ў газетах і часопісах. Ужо на зыходзе жыцця быў прыняты ў Саюз журналістаў Беларусі. У зборніках вершаў «Роздум над вечнасцю», «Натхненне», «На зямлі Залатавуста», прысвечаных Тураву, змешчаны творы бацькі і яго дзяцей – Галіны і Аляксандра.



Адсюль (з маленства, з роднай хаты, ад роднай зямлі) і прыняла свой паэтычны дар Г. Клімовіч. Спраўдзіліся надзеі бацькоў: Галіна – студэнтка Мазырскага педагагічнага інстытута, а потым – настаўніца мовы і літаратуры. Яшчэ ў студэнцкія гады яна стала актрысай Мазырскага народнага тэатра, выдатнай чытальніцай паэтычных твораў. Галіна з захапленнем выконвала ролі Паўлінкі ў камедыі Янкі Купалы, Зосі ў яго драме «Раскіданае гняздо», Надзеі і Зіны ў трагікамедыі Андрэя Макаёнка «Трыбунал» і іншыя.

«Эмацыйная, вельмі непасрэдная, з велізарным абаяннем, яна прынесла з сабой на сцэну паэзію зялёных лясоў і ціхіх рэк. Свет купалаўскіх герояў стаў надзвычай блізкім для Галіны. Роля Зоські яе літаральна захапіла». Так сказаў пра Галіну заслужаны дзеяч культуры Беларусі, вядомы рэжысёр Міхаіл Колас у артыкуле «Знайсці сваю дарогу» («Советская Белоруссия», 22 кастрычніка 1968 года).

Больш за дваццаць гадоў Г. Дашкевіч аддала тэатру, на аснове якога сёння створаны прафесійны драматычны тэатр імя Івана Мележа, а выкладчыцкай працы і паэтычнай творчасці – усё жыццё.

Хутка ідзе час. Сталі дарослымі дзеці, падрастаюць унукі, але застаецца Галіна Мікалаеўна ўсё той жа яснавокай Паўлінкай, якую іграла на сцэне.

Літаратурны дэбют Галіны Мікалаеўны адбыўся ў 1964 годзе ў газеце «Камуніст Палесся». Яе паэтычны дар заўважылі. Вершы былі прыхільна сустрэтыя чытачамі, якіх прывабіла шчырасць і душэўная адкрытасць мастацкіх вобразаў. «Верасніца» (1997 г.) – такую ласкавую назву дала сваму першаму зборніку паэтэса. Верасніца – гэта назва вёскі на Тураўшчыне. Назвы палескіх вёсак выклікаюць у душы паэтэсы пяшчоту і замілаванне:

*Верасніца, Любавічы, Азяраны,*
*Вы – як кветкі на абрусе*
*саматканым,*
*Дыяменты роднай мовы*
*беларускай,*
*Вымаўляю – і пяю не напяюся.*

Вершы Галіны Мікалаеўны друкаваліся ў калектыўных зборніках «Палескія перазвоны», «Ты, Мазыр, – мой Парнас», «Роздум над вечнасцю», «Натхненне», «На зямлі Залатавуста», «Святло шчымлівай памяці», «Званы сумлення», у зборніку вершаў мазырскіх паэтаў для дзяцей «Сонца над буслянкай», у часопісах «Полымя», «Маладосць», «Першацвет», «Бярозка» ды іншых выданнях.

У 2001 годзе выходзіць кніга вершаў Г. Дашкевіч «Паўлік кніжачку чытае» – цудоўны падарунак для дзяцей малодшага школьнага ўзросту. «Паэтка можа зачараваць юных чытачоў і незвычайнай прыгажосцю беларускай прыроды, і жаўруковым трапятаннем роднага слова», – адзначана ў анатацыі да зборніка.

У 2006 годзе Галіна Дашкевіч была прынятая ў Саюз беларускіх пісьменнікаў. Галіну Мікалаеўну з задавальненнем запрашаюць на мерапрыемствы, творчыя сустрэчы ва ўстановы Мазыра і раёны Гомельшчыны. У нашай бібліятэцы яна заўсёды чаканы госць. Госцю прыемна слухаць, родная мова з яе вуснаў ліецца бы меладычная песня:

*На Палессі не гавораць,*
*а спяваюць,*
*Мову родную да сэрца прытуляюць.*
*Так дзядуля мой спрадвеку*
*рэзаў бохан,*
*Як свяцейшы скарб,*
*дараваны ад Бога...*

Галіна Дашкевіч – паэтэса, якая здолела захаваць у сваёй душы імкненне да прыгажосці, дабрыню, спагадлівасць да людзей.

*Прысніўся мне бераг*
*з разбуджаным ветрам трысцём*
*І вяз з неўгамонным,*
*руплівым птушыным гняздом,*
*І маміна вішня з квітнеючай*
*голькай сняготу,*
*І прызба ля хаты –*
*буслянка бабуль і дзядоў,*
*І серп на гарышчы,*
*што мама для нас прыпасла,*
*І папараць-кветка,*
*што з сэрца праз жвір прарасла...*

***Т. БЕРНІК,***
***бібліятэкар I катэгорыі***
***бібліятэкі-філіяла № 1***
***г. Мазыра***